АЛЯКСАНДР ЖУКОЎСКІ

# *Дарагія мае* ЗЕМЛЯКІ

Артыкулы
Інтэрв’ю
Нататкі
Замалёўкі

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2019

УДК 821.161.1(476)-1
ББК 84(4Беи)-5
Ж86

**Жукоўскі, А. М.**
Ж86 Дарагія мае землякі : артыкулы, інтэрв'ю, нататкі, замалёўкі / Аляксандр Жукоўскі. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2019. — 116 с.
ISBN 978-985-581-321-8.

У кнізе сабраны аповеды пра малую радзіму аўтара — Клеччыну — і яе слаўных жыхароў, якія вызначаюцца патрыятызмам, мужнасцю, працавітасцю, прафесіяналізмам, аптымізмам і іншымі станоўчымі рысамі характару. Гэтыя лепшыя чалавечыя якасці героі захоўваюць заўсёды, дзе б ні апынуліся па волі лёсу.

**УДК 821.161.1(476)-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-581-321-8**

© Жукоўскі А. М., 2019
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва "Чатыры чвэрці"», 2019

*Прысвячаецца*
*Году малой радзімы*

# Слова да чытача

Так хочацца быць патрэбным
Не толькі сябрам — Радзіме.
Адкінуць з душы атрэб'е
І славіць куточак дзіўны.

*Мікола Шабовіч*

Я нарадзіўся на Клеччыне. Тут прайшло маё дзяцінства, азмрочанае вайной. Тут пачаўся і завяршыўся мой працоўны шлях.

У 1999 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» пабачыла свет гісторыка-дакументальная хроніка «Памяць. Клецкі раён». Мне пашчасціла быць старшынёй камісіі і членам рэдкалегіі па яе стварэнні. У названай кнізе расказваецца аб нашай гісторыі, аб вядомых земляках.

Мне пашанцавала з членамі камісіі. Усе яны прымалі актыўны ўдзел у стварэнні хронікі. Вялікую ролю ў гэтай карпатлівай працы праявіла намеснік старшыні камісіі Лілія Віктараўна Мялешка.

Даводзілася шмат часу займацца арганізацыйнымі пытаннямі: працаваць у архівах, сустракацца з вучонымі, са знакамітымі людзьмі і, такім чынам, чэрпаць неабходны матэрыял. Таму маіх уласных друкаваных твораў у кнізе нямнога. Лілія Віктараўна і рэдактар-укладальнік Мікола Кусянкоў, вядомы беларускі пісьменнік (светлая яму памяць), сабраны матэрыял давялі да якаснай мастацкай і ідэйнай кандыцыі.

Прайшло два дзесяцігоддзі пасля выхаду хронікі. Жыхары раёна любяць Клеччыну і ганарацца родным краем, яго працавітымі людзьмі, якія праслаўляюць наш надзвычай прыгожы куточак і сёння.

Дарагія чытачы! Буду задаволены і шчыра ўдзячны вам, калі мае аповеды выклічуць у вас цікавасць і гэтая кніга хоць крыху дапоўніць хроніку «Памяць. Клецкі раён».

# Школа на хвалі часу

*У раздзеле апавядаецца пра навучальныя ўстановы, педагогаў, якія ў розныя гады працавалі ў сістэме адукацыі і вырашалі важнейшыя праблемы па ўдасканаленні вучэбна-выхаваўчага працэсу.*

# Перад стартам усесаюзнага агляду

Як вядома, для стымулявання пастаяннага росту кваліфікацыі, павышэння ідэйна-палітычнага ўзроўню настаўніцкіх кадраў 16 красавіка 1974 года ўрад Саюза ССР прыняў пастанову «Аб атэстацыі настаўнікаў агульнаадукацыйных школ».

У студзені 1977 года каля чатырохсот настаўнікаў нашага раёна стануць на старт Усесаюзнага агляду. Атэстацыя дапаможа нам палепшыць якасны склад педагагічных кадраў, перш за ўсё іх адукацыйны ўзровень. На сёняшні дзень у раёне ўсяго 63% настаўнікаў маюць вышэйшую адукацыю, у той час як па Мінскай вобласці — 67%. І невыпадкова мы падвяргаліся крытыцы па гэтым пытанні на пленуме абласнога камітэта партыі, які адбыўся ў кастрычніку бягучага года.

Атэстацыя з'яўляецца стымулам для павышэння ідэйна-маральнага аблічча настаўнікаў. У ходзе падрыхтоўкі да атэстацыі неабходна павысіць узровень работы тэарэтычных семінараў, кіраўнікам школ — узмацніць кантроль за самаадукацыяй настаўнікаў. Ва ўсіх педагагічных калектывах патрэбна правесці сур'ёзную размову аб маральным абліччы асобных настаўнікаў. Некаторыя педагогі, на шчасце іх мала, апусціліся, сталі абывацелямі і мяшчанамі. Яны адмаўляюцца ад класнага кіраўніцтва, праяўляюць прагнасць, няўжыўчывасць з суседзямі.

Аднак іх учынкі і дзеянні не знаходзяць прынцыповай ацэнкі калег па рабоце.

Не ва ўсіх школах адчуваецца набліжэнне атэстацыі. Так, і некаторыя настаўнікі Зубкаўскай сярэдняй школы маюць смутнае ўяўленне аб атэстацыі. У Заастравецкай сярэдняй школе да гэтага часу яшчэ не аформлены куток па атэстацыі.

Кіраўнікам школ неабходна дамагчыся такога становішча, каб кожны настаўнік пранікнуўся ідэямі і мэтамі будучай атэстацыі. Для гэтага патрэбна даць доступ кожнаму педагогу да матэрыялаў па атэстацыі, арганізаваць у школах кансультацыі па ўзнятых пытаннях. За настаўнікамі, якія маюць патрэбу ў дапамозе, неабходна замацаваць вопытных выкладчыкаў.

Да пачатку новага навучальнага года ў раёне не павінна застацца ніводнага настаўніка, які б своечасова не пабываў на курсах пры абласным або рэспубліканскім інстытутах удасканалення настаўнікаў.

У перыяд падрыхтоўкі да атэстацыі кіраўнікі школ і прафсаюзныя камітэты сталі надаваць больш увагі абагульненню і ўкараненню перадавога педагагічнага вопыту. Асабліва добра гэта работа арганізавана ў Ліскаўскай сярэдняй школе. Тут абсталяваны змястоўны метадычны кабінет, у якім матэрыялы перадавога вопыту афармляюцца ў спецыяльных папках, альбомах, на стэндах. У кабінеце многа метадычнай літаратуры, дастатковая колькасць рабочых месцаў, дзе настаўнікі маюць усе ўмовы для працы і падрыхтоўкі да чарговых заняткаў. Нядаўна Ліскаўскую школу наведалі ўдзельнікі рэспубліканскага семінара загадчыкаў райметадкабінетаў і засталіся задаволенымі. Вопыт метадычнай работы школы заслугоўвае пераймання.

Але, на жаль, у нас ёсць школы, дзе абагульненню і ўкараненню перадавога педагагічнага вопыту не надаецца належнай увагі. Гэта ў першую чаргу тычыцца Зубкаўскай, Дунайчыцкай, Комлеўскай школ.

У ходзе падрыхтоўкі і правядзення атэстацыі нам неабходна выявіць сціплых, але добрасумленных педагогаў, вопыт якіх заслугоўвае распаўсюджвання і пераймання.

Атэстацыя адыграе сваю станоўчую ролю толькі ў тым выпадку, калі кожнаму настаўніку будзе дадзена аб'ектыўная і кваліфікаваная характарыстыка. Але, дзе кіраўнікі школ несістэматычна, павярхоўна вывучаюць работу педагогаў, там адсутнічае глыбокі аналіз і ацэнка работы настаўнікаў.

Для таго каб правільна напісаць характарыстыку, патрэбна перагледзець запісы наведаных урокаў, пратаколы педсаветаў, вытворчых нарад і інш. Важна знайсці штосьці своеасаблівае, індывідуальнае ў рабоце кожнага настаўніка. Кіраўнікам школ, даючы ацэнку настаўніку, трэба праяўляць патрабавальнасць і добразычлівасць.

# Змест

Слова да чытача . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 4

**ШКОЛА НА ХВАЛІ ЧАСУ**

Перад стартам усесаюзнага агляду. . . . . . . . . . . . . . . . . . 6
Сейбіты разумнага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
Стваральнікі духоўнага свету. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9
Распарадак назаўтра . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11
Галоўнае — здароўе і лагічнае мысленне . . . . . . . . . . . . 22
Падарожжа ў краіну Хімляндыю . . . . . . . . . . . . . . . . . . 24
У Морацкай СШ. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
    Тры функцыі цяпліцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
    Нельга прайсці міма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
Каб кветкі цвілі і ў сэрцах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
    Кветкава-дэкаратыўны аддзел. . . . . . . . . . . . . . . . . . 29
Да прыёму вучняў падрыхтаваліся якасна . . . . . . . . . . . . 30
    Вопыт, варты для пераймання. . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
    Пасябравалі з беражлівасцю . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32
    Стала больш утульнай. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32
    Аналага ў раёне няма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
    Памаладзела . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34
    Любыя задачы — пад сілу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 34
    Дапамога шэфаў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35
«Зрабіць вучэбную дзейнасць неабходнай
і радаснай для кожнага школьніка...» . . . . . . . . . . . . . . 36

**КЛАПАЦІЦЦА АБ ЛЮДЗЯХ**

Стандарт — не трафарэт. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 40
Нейтралізаваць дэмаграфічныя пагрозы . . . . . . . . . . . . . 44

...І нізка вам яшчэ раз пакланіцца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .48
Дабравольна пайшла на фронт . . . . . . . . . . . . . . . . . . .48
Несціхаючы боль. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .48
Яны — наша слава і гордасць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .49
Замест эпілога . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .50
Як набрацца вопыту, клапаціцца аб людзях? . . . . . . . . . . . . . .51
«Не загадваць, а пераконваць» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .53
«...Не толькі ініцыятыва і энтузіязм,
але і кампетэнтнасць» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .56

## ДАРАГІЯ МАЕ ЗЕМЛЯКІ

Слаўны працаўнік і абаронца Радзімы . . . . . . . . . . . . . . . . . .60
Сапраўдны патрыёт . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .62
Артыстка з народа . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .64
Старасць яго дома не застане . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .67
Пакінуў светлую памяць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .73
Жыццё для людзей . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .75
Дорыць добрае жыццё . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .80
Кузня кадраў масавых прафесій . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .82
Знайшоў свой мосцік. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .83
Душой малады . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .88
Наканавана было выжыць . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .91
Імкнуся ў родныя мясціны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .93
З пачуццём адказнасці і бескарыслівасці. . . . . . . . . . . . . . . .95
Івану Сцяпанавічу Ільюкевічу. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .97
Не пакідай, шчасце, і наш куток. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .99
Мае слаўныя аднавяскоўцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .101

Эпілог . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .107